УДК 378.147:808.26

Т. У. Жукоўская, выкладчык

# ВУЧЭБНЫЯ ДЭБАТЫ ЯК ФОРМА ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

The article describes in details methods and practices of conducting scholastic debates to stimulate studentst' learning activity while studying the Belarusian language.

У педагагічнай практыцы пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў прыярытэтнай мэтай з'яўляецца адукацыя і выхаванне асобы XXI стагоддзя – стагоддзя высокіх тэхналогій, новых адкрыццяў і сацыяльных змен. Педагагічны вопыт нашай краіны пераканаўча сведчыць аб тым, што сучаснаму грамадству патрэбна пакаленне людзей, якія маюць навыкі партнёрства і кааперацыі з іншымі людзьмі ў дасягненні агульных мэтаў; пачуццё ўласнай годнасці; крытычнае мысленне, накіраванае на пошук рашэнняў і альтэрнатыў, умеюць рабіць свядомы і матываваны выбар; самастойна плануюць уласную дзейнасць і адказваюць за свае ўчынкі.

Многія знакамітыя педагогі – К. Ушынскі, Л. Выгоцкі і іншыя – лічылі, што неабходнай умовай навучання з'яўляецца вучэбнае супрацоўніцтва. Так, вялікі псіхолаг Ж. Піажэ сцвярджаў, што толькі супрацоўніцтва прыводзіць да развіцця логікі навучэнца. Адной з цэнтральных праблем сучаснага вучэбнага працэсу з'яўляецца развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў. Як адзначаюць некаторыя педагогі, характэрнымі рысамі свабоднай творчай асобы з'яўляюцца самастойнасць мыслення і крытычнасць адносін да атрыманай інфармацыі. Дэбаты, даследаванні, аналіз і пошук доказаў – усе гэтыя навыкі звязваюцца з паняццем «крытычнае мысленне». Навучанне крытычнаму мысленню – задача не з простых. Можна спрачацца аб тым, ці сапраўды малады спецыяліст за час навучання ва універсітэце атрымаў поўны пакет навыкаў, але ніхто не сумняваецца, што іх можна і патрэбна прывіваць.

Абагульняючы ўсё выказанае, можна сцвярджаць, што разнастайныя інтэрактыўныя метады навучання пры выкладанні беларускай мовы з'яўляюцца вельмі эфектыўнай формай вырашэння пастаўленых задач. Для актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў значнае месца займаюць **вучэбныя дэбаты**. На занятках важна не толькі даць веды па граматыцы і краіназнаўству, але і абудзіць узнаўляльную і творчую пазнавальную дзейнасць, выклікаць унутраную актыўнасць для творчага пошуку, жаданне даведацца новае пра гісторыю, культуру сваёй краіны. Тут жа студэнты могуць пазнаёміцца з такімі паняццямі, як «майстэрства пераканання», «довады» і «навыкі вырашэння праблем». Пры тым неабходна помніць, што крытычнае мысленне павінна быць неад'емнай часткай усяго вучэбнага працэсу. Адзін з напрамкаў для распрацоўкі мадэлі навучання крытычнаму мысленню, якое ляжыць у аснове дэбатаў, заснаваны на развіцці ўмення аргументаваць. Хаця існуюць дзесяткі азначэнняў крытычнага мыслення, але ў большасці з іх гаворыцца аб здольнасці ўважліва вывучаць сцвярджэнне, вывады і прапановы.

**Дэбаты** (ад фр. debats) – абмеркаванне якога-небудзь пытання, абмен думкамі, публічная спрэчка з мэтай пошуку ісціны шляхам супастаўлення розных меркаванняў і пунктаў гледжання. У аснове дэбатаў ляжыць свабоднае выказванне, абмен думкамі па прапанаванаму тэматычнаму тэзісу. Асноўная задача дэбатаў – дасягненне яе ўдзельнікамі згоды па тым ці іншым пытанні або вызначэнне шляхоў і падыходаў для яго вырашэння. Удзельнікі дэбатаў самастойна падыходзяць да рашэння пастаўленай задачы, загадзя рыхтуючы аргументацыю і больш глыбока прапрацоўваючы матэрыял па дадзенай тэме, прыводзяць прыклады, факты, абгрунтоўваюць іх, лагічна даказваюць, тлумачаць, даюць інфармацыю і г. д. Трэба адзначыць, што сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў дэбатах, павінны прызнавацца ўсімі яе ўдзельнікамі, бо стыхійна можа ўзнікнуць спрэчка з-за чыёйсьці памылкі, туманнай фармулёўкі, рэзкага выказвання ці саркастычнай рэплікі. Таму працэдура дэбатаў не дапускае асобасных ацэнак, эмацыянальных усплёскаў і іншых праяўленняў удзельнікаў. Павінна абмяркоўвацца тэма, а не адносіны да яе. У гэтым сэнсе дэбаты прывучаюць студэнтаў да культуры вуснага выступлення, правільных паводзін падчас дыялогу, умення слухаць і чуць іншых, ацэнкі ўласных магчымасцей і г. д.

Дэбаты ў вучэбных мэтах не зусім звычайная з'ява для студэнцкай аўдыторыі, але пры прэзентацыі рэфератыўных тэм, творчых праектаў на занятках беларускай мовы дадзеная форма стварае ўмовы для актыўнага навучання. Правядзенню вучэбных дэбатаў павінна папярэднічаць пэўная падрыхтоўчая работа, якая складаецца з наступных этапаў:

– наяўнасць матэрыялаў па вызначанай тэме (у нашым выпадку – аб'яўленне тэмы рэферата, якая будзе гучаць на наступных занятках, вывучэнне неабходных матэрыялаў, збор фактычных дадзеных);

– азнаямленне ўдзельнікаў з правіламі арганізацыі і правядзення дэбатаў (звычайна гэта робіцца на першых занятках);

– вызначэнне зыходнага тэзіса дэбатаў;

– навучанне арганізатараў дэбатаў, размеркаванне роляў і даручэнняў;

– індывідуальны інструктаж аб працэдуры дэбатаў.

Выкладчык можа загадзя падрыхтаваць некалькі тэзісаў для дэбатаў. **Тэзіс** – гэта сфармуляванае палажэнне, якое коратка перадае асноўную думку рэферата, даклада, творчага праекта і г. д. Важна растлумачыць, што тэзіс фармулюецца ў сцвярджальнай форме і прадугледжвае антытэзіс. Для работы над тэзісам ствараецца некалькі мікрагруп. Пасля вызначэння тэзісаў уся група выбірае шляхам галасавання або па рэйтынгу лепшы з іх для дэбатаў. Тэзіс павінен быць сфармуляваны на рацыянальнай і пераканаўчай аргументацыі. Згодна з распаўсюджанай мадэллю амерыканскага педагога С. Турміна, аргументы павінны складацца з чатырох асноўных частак: сцвярджэння, дадзеных, падставы і падмацавання. Прывядзём табліцу элементаў аргументацыі па С. Турміну:

1) сцвярджэнне – тэзіс, які прапануе выступоўца, жадаючы, каб яго прызнала аўдыторыя. Да сцвярджэнняў адносяцца, напрыклад, вывады, меркаванні, інтэрпрэтацыі, прапановы;

2) дадзеныя – сведчанні, якія выкарыстоўваюцца для абгрунтавання сцвярджэння;

3) падстава – гэта звяно, якое звязвае дадзеныя і сцвярджэнне, тлумачэнне таго, як заяўленыя дадзеныя падмацоўваюць сцвярджэнне;

4) падмацаванне – дадатковы доказ, які выкарыстоўваецца, каб узмацніць падставу.

У сукупнасці гэтыя чатыры кампаненты ствараюць рацыянальны нефармальны аргумент.

Тэзіс фармулюецца ў залежнасці ад мэты дэбатаў – гэта можа быць абмеркаванне праблем выхавання сучаснай моладзі па тэме рэферата «Народная педагогіка беларусаў»; экалагічных праблем рэспублікі і рэгіёнаў па тэме рэферата «Экалогія Беларусі»; праблем захавання культурных каштоўнасцей нацыі па тэме рэферата «Этнаграфія Беларусі»; замацаванне ведаў па тэмах «Знакамітыя людзі зямлі беларускай», «Беларускае кнігадрукаванне», «Мастацтва Беларусі», «Тэатры Беларусі» і інш.; фарміраванне практычных уменняў і навыкаў арганізацыі і правядзення саміх дэбатаў і г. д.

Прадставім **правілы** правядзення вучэбных дэбатаў, якія выкарыстоўваюцца на занятках па беларускай мове. Дэбаты павінны праходзіць пад кіраўніцтвам вопытнага, тактоўнага, цвёрдага па характары чалавека, які ўмее «трымаць» аўдыторыю. З ліку студэнтаў выбіраецца Старшыня, які арганізуе і праводзіць дэбаты. Кіраўнік дэбатаў павінен жорстка сачыць за рэгламентам; спыняць тых, хто не ўкладаецца ў вызначаны час; не ўмешвацца ў спрэчку самому; не дапускаць некарэктных выказванняў; даваць магчымасць выказацца ў другі раз толькі пасля таго, як усе ўдзельнікі ўжо выказаліся; у выпадку неабходнасці пазбаўляць слова тых, хто не захоўвае правілы і этыку дэбатаў. Рэгламент дэбатаў вызначаецца загадзя і можа выглядаць наступным чынам:

1. Галоўнае выступленне на зададзеную тэму (тэзіс і аргументацыя) – 5–7 хвілін.

2. Выступленне ўдзельнікаў – 2–3 хвіліны.

3. Каментарыі да выступленняў, якія могуць узнікнуць у кіраўніка дыскусіі і яе ўдзельнікаў – 0,5–1 хвіліна.

4. Заключнае выступленне – 2–3 хвіліны.

Перад дэбатамі ўдзельнікі займаюць месцы адпаведным чынам: справа ад Старшыні – абаронцы тэзіса (3–4 студэнты), злева – праціўнікі тэзіса (3–4 студэнты), пасярэдзіне – студэнты, якія не маюць пэўнага пункту гледжання. Кожны прамоўца павінен пачынаць сваё выступленне са звароту да вядучага дыскусіі: «Спадар Старшыня...», а ў працэсе дэбатаў звяртацца адзін да аднаго: «Спадар (Спадарыня)...».

У дэбатах выступаюць па чарзе абаронцы і праціўнікі тэзіса. Першым выказваецца той, хто абараняе тэзіс і адначасова яго развівае. Потым выступае галоўны прамоўца ад апазіцыі, які фармулюе і абараняе антытэзу. Наступныя выступоўцы з абодвух бакоў па чарзе прыводзяць аргументы на карысць свайго тэзіса (антытэзіса). Апошнія падагульняюць тое, што было сказана абодвума бакамі падчас дэбатаў.

Пасля выступлення галоўных прамоўцаў пачынаюцца дэбаты сярод іншых студэнтаў (кожны з прысутных мае права голасу). Дэбаты працягваюцца да таго часу, пакуль не выкажуцца ўсе жадаючыя. Выступленні праходзяць за кафедрай.

Неабходна імкнуцца да таго, каб абмеркаванне вялося вакол вылучанага тэзіса, бо вельмі часта ў працэсе дэбатаў адна думка цягне за сабой іншую, узнікаюць новыя асацыяцыі і новыя мысляформы, што адцягвае ад асноўнай тэмы. Вельмі важна, каб усе выступоўцы ўмелі цярпліва выслухоўваць і не перабіваць адзін аднаго. Культура дэбатаў і заключаецца ў тым, што кожны яе ўдзельнік мае права на сваё меркаванне, а астатнія абавязаны яго выслухаць.

Удзельнікі на працягу ўсяго часу, адведзенага на дэбаты, маюць права задаваць пытанні і даваць інфармацыю, пры гэтым устаючы з месца і падымаючы руку, кажуць: «Пытанне» або «Інфармацыя».

Пасля дэбатаў праводзіцца галасаванне, дзе ўсе выказваюцца на карысць выбранай пазіцыі. Пры галасаванні павінен ацэньвацца не тэзіс, а аргументы, прадстаўленыя бакамі.

Прывядзём тэмы для дэбатаў па некаторых рэфератах, якія дапускаюць далейшую фармулёўку тэзісаў шляхам сумеснага абмеркавання ў групе:

• Беларусь – суверэнная цывілізаваная дзяржава з самастойнай, моцнай і сапраўды народнай палітыкай (па рэфераце «Беларусь на карце свету»).

• Выхаваўшы асобу, мы выхоўваем будучыню нашай дзяржавы (па рэфераце «Народная педагогіка беларусаў»).

• Экалогія Зямлі – экалогія душы (па рэфераце «Экалогія Беларусі»).

• Трыумф і трагедыя Францыска Скарыны (па рэфераце «Беларускае кнігадрукаванне»).

• Сучасная вучэбная ўстанова – школа жыцця, сацыяльны цэнтр, які фарміруе нормы культуры, маральнасці, перакананняў (па рэфераце «Адукацыя і асвета на Беларусі»).

• Свабода веравызнання як адна з агульначалавечых і агульнадэмакратычных свабод (па рэфераце «Рэлігіі на Беларусі»).

Падвядзенне вынікаў дэбатаў карысна правесці ў форме свабоднага абмеркавання з удзелам усіх жадаючых. Для гэтага могуць быць прапанаваны наступныя пытанні:

1. Ці з'яўляецца актуальным тэзіс дэбатаў?
2. Ці дасягнута галоўная мэта дэбатаў?
3. Ацаніце актыўнасць удзельнікаў дэбатаў.
4. Чые выступленні вам асабліва спадабаліся і запомніліся? Чаму?
5. Чаму некаторыя ўдзельнікі дэбатаў адмоўчваліся? або праяўлялі эмоцыі, суперажывалі і г. д. Ацаніце агульную культуру ўдзельнікаў (уменне слухаць, выступаць, стрымліваць).
6. Вашы прапановы па ўдасканаленні дэбатаў.

Прымяненне вучэбных дэбатаў, як і іншых актыўных формаў навучання, дазваляе ажыццявіць пераход ад традыцыйнага, рэпрадукцыйнага спосабу выкладання і засваення матэрыялу да найбольш высокіх узроўняў самастойнай дзейнасці студэнтаў – праблемнага, пошукавага і даследчыцкага. Веды ў дадзеным працэсе з'яўляюцца не самамэтай, а сродкам развіцця студэнта, які стаіць перад неабходнасцю абгрунтоўваць, даказваць і правяраць сваю думку і думку суразмоўцы. Паспяховае фарміраванне гатоўнасці да самастойнай камунікатыўнай дзейнасці, якая праяўляецца падчас дэбатаў, прадугледжвае:

– прадуманую арганізацыю дэбатаў, у якіх арганічна ўплецена самастойная праца як пазнавальная дзейнасць;

– улік інтарэсаў, патрэбнасцяў, індывідуальных асаблівасцяў кожнага студэнта;

– сумесную вучэбную дзейнасць, якая дапаможа студэнтам уключыць новы матэрыял у свае выказванні, трансфармаваць, камбінаваць яго з ужо засвоеным і, такім чынам, узбагачаць веды і ўдасканальваць уменні;

– сумесную дзейнасць выкладчыка і студэнта, у якой апошні павінен усведамляць сябе суб'ектам вучэбнай дзейнасці;

– неабходныя ўмовы для рэалізацыі гатоўнасці і жадання дзейнічаць самастойна: стварэнне атмасферы добразычлівасці, даверу, узаемаразумення і творчасці.

Усё сказанае дазваляе зрабіць выснову, што толькі ўмелая арганізацыя дэбатаў выкладчыкам і актыўнае ажыццяўленне студэнтамі поўнага цыкла дадзенай формы пазнавальнай дзейнасці забяспечваюць грунтоўнае авалоданне імі вывучаемым матэрыялам, развіццё іх разумовых і творчых здольнасцяў, фарміраванне самасвядомасці, светапоглядных перакананняў, маральна-этычнай і моўнай культуры, павышаюць адказнасць за вынікі сваёй працы і працы партнёраў, фарміруюць адэкватную ацэнку сябе і іншых.

Як мы бачым, згодна з прынцыпамі інтэрактыўнай педагогікі, гэты від навучальнай дзейнасці павінен быць спланаваны (дакладна вызначана канчатковая мэта методыкі), структураваны (лагічна пабудаваны этапы праходжання да пастаўленай мэты), сканцэнтраваны (усё навучальнае ўзаемадзеянне адбываецца тут і цяпер), адрэфлексаваны (аналіз па загадзя прадуманаму тэзісу з мэтай асэнсавання тых аспектаў, якія зацікавілі аўдыторыю). Да таго ж тэхналогія дадзенага калектыўнага спосабу навучання дапамагае вырашаць задачы развіцця адвольнай устойлівай увагі студэнта сродкамі пазнавальнага інтарэсу; развіцця ўласнага пазнавальнага інтарэсу сродкамі часткова-пошукавай канструктыўнай дзейнасці; развіцця творчага мыслення; развіцця камунікатыўна-моўных і агульнавучэбных уменняў і навыкаў; стварэння асяроддзя, адаптаванага для развіцця студэнта; ажыццяўлення рэфлексіі, забеспячэння ўсіх відаў падтрымкі.

Нам падаецца, што менавіта дэбаты, як адна з формаў інтэрактыўнага навучання, дзе вырашаюцца разнастайныя педагагічныя задачы, дазволяюць выкладчыку арыентавацца на сучасныя патрабаванні да адукацыйнага працэсу, а студэнту дапамагаюць не толькі глыбока авалодаць ведамі, актывізаваць сваё вуснае маўленне, але і рэалізаваць сябе ў сумеснай пазнавальнай дзейнасці з улікам уласных магчымасцей і здольнасцей.